**АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ ЕЛЬСКАГА РАЙВЫКАНКАМА**

**КОНКУРС ТВОРЧЫХ ПРАЕКТАЎ**

**“МАЯ МОВА, МАЯ КУЛЬТУРА, Я»**

**КОНКУРСНЫ КІРУНАК**
**ЭСЭ**
**“Я НАРАДЗІЎСЯ ТУТ”**

# *ЭСЭ “МОЙ КУТОЧАК”*

Аўтар: Гуд Юрый (Гуд Юрий)9 клас
дзяржаўнай установы адукацыі
«Рамязоўскі яслі-сад- сярэдняя школа
Ельскага раёна»
Адрас: 247832, в. Рамязы, вул. Савецкая, 26
тэл. (02354) 34- 1-59
e-mail: Troshko4@rambler.ru
Кіраўнік: Трошка Людміла Фадзееўна,
настаўнік гісторыі

## Мой куточак

Мой родны кут, як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы!
Я. Колас

Гэтыя радочкі нашага класіка я заўсёды ўспамінаю, калі гаворка ідзе пра нешта роднае: Радзіму, вёску, вуліцу, бацькоў, сяброў…

Я перакананы, што кожная травінка, кветка, як і чалавек, не падобны на зямлі. Вось і мая вёска індывідуальна і, як і кожнаму, здаецца мне  самай мілай, прыгожай. Мне наогул не падабаюцца вялікія гарады з іх мітуслівасцю, шматфарбнасцю, дзе кожны чалавек лічыць сябе адначасова сваім і чужым. А ў вёсцы хіба што родзічы, якія даўно не былі тут, або госці выклікаюць цікавасць і нейкую занепакоенасць, быццам яны прэтэндуюць на нешта асабіста ваша, тваё.

У кожнага чалавека ёсць свой родны вугалок зямлі, дзе ён нарадзіўся, зрабіў свае першыя крокі, навучыўся любіць і цаніць сваю Радзіму. Для мяне гэта бацькоўскі дом, родная вёска.

Мяне завуць Юрый. Вучуся я ў 9 класе Рамязоўскага яслей-сада - сярэдняй школы, які знаходзіцца ў прыгожай вёсцы Рамязы Ельскага раёна, Гомельскай вобласці. Дзякуючы краязнаўчаму гуртку, які дзейнічае пры школьным музеі, я шмат даведаўся  пра гісторыю вёскі. Вёска Рамязы  - маляўнічая, своеасаблівая, з найбольш старадаўніх і з багатай гісторыяй вёсак раёна, размяшчаецца ў адным з прыгажэйшых вугалкоў беларускага Палесся. Гэта  былы цэнтр Рамязоўскага сельскага Савета. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 16 стагоддзя як сяло ў Мазырскім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) увайшла ў склад Расійскай  імперыі.  У ваколіцах вёскі знаходзіцца некалькі курганоў – сведчанне таго,  што людзі жылі тут шмат стагоддзяў назад.

А вы спытаеце, чаму яна так называецца? Толькі дзякуючы повязі пакаленняў да нас дайшлі цікавыя гісторыі пра назву вёскі.

У ваколічных месцах вадзіліся калісьці вельмі прыгожыя пеўчыя птушкі рэмезы. А ёсць і іншая легенда – жыў тут пан, у якога быў сабака. Звалі забаву пана Рэмез. Здарылася, што ў час палявання на гэтым месцы Рэмез гіне. Гаспадар яго тут жа пахаваў і назваў гэтае месца Рэмезы, а з цягам часу э перайшло ў а і стала вёска называцца Рамязы.

Мой родны куточак размешчаны ў прыгожым і ціхуткім месцы, дзе заўсёды можна адпачыць душой і думкамі. Вакол вёсачку абступаюць шырокія лясы са сваімі стройнымі высокімі бярозамі,  хвоямі, з магутнымі вартаўнікамі – дубамі, якія як волаты ўзвышаюцца над узлескамі. Амаль за вёскай льецца-пераліваецца прыгажуня рака Чэрцень. А з другога боку вёскі размясцілася невялічкае азярцо з гістарычнай назвай Турскае, якое прыходзіць на дапамогу ў летнюю спёку.

...А палі, палі... колькі прастору! Усё гэта нездарма, бо  зараз  чалавек імкнецца знайсці для сябе найбольш прыстасаванае і прывабнае месца жыхарства. Атрымліваецца, што сапраўды такой для  рамязоўцаў  і з’яўляецца іх родная вёска.

Розныя людзі жывуць у Рамязах. У кожнага з іх свой адметны лёс, свой характар, свае мары і надзеі.

У нас жылі і жывуць людзі, якія шмат зрабілі дабра, плённа і творча працавалі, змагаліся з ворагамі, вырошчвалі хлеб, узводзілі будынкі, вучылі і выхоўвалі дзяцей, упрыгожвалі свой куточак.

Сярод іх пісьменнік Іван Капыловіч, былы старшыня калгаса “Партызан” Дворак Міхаіл Платонавіч, Цімошчанка Павел Васільевіч, механізатар, двойчы кавалер ордэна Працоўнай Славы 1 і 2 ступені, даярка Клянёва Марыя Іванаўна, былая цялятніца Бардашэвіч Таццяна Дзянісаўна, якая была ўзнагароджана ардэнамі “Леніна” і “Чырвонага сцяга”і многія іншыя. На жаль, не засталося ўжо ветэранаў вайны, але памяць пра іх жыве.

Мая радзіма багата на таленты, без якіх не абыходзіцца ніводнае свята. Сярод гэтых талентаў вылучаецца самадзейны мастацкі калектыў “Крыніцы”, які дзейнічае пры Рамязоўскім Доме культуры. Калектыў напоўнены змястоўнай творчай працай па прапагандзе нацыянальнай песеннай культуры і беларускага слова. Яго салістка, Сыч Марыя Лук’янаўна, лаўрэат многіх конкурсаў раённага і абласнога ўзроўняў.

Зараз вёска Рамязы – самая прыгожая ў Ельскім раёне, з 2010 года ствараецца аграгарадок. Праведзены рамонтныя работы школы, Дома культуры, фапа, магазінаў.

Гісторыя вёскі як у люстэрку адлюстроўвае гісторыю ўсёй краіны. Яе не абышлі ні ліхалецці, ні войны, ні рэвалюцыі. Нягледзячы на гэта, вёска прадаўжае жыць. Зараз у ёй пражывае 426 жыхароў, гуляюць вяселлі, нараджаюцца дзеці. А галоўнае – нараджаецца хлеб на палях. А будзе хлеб – будзе і жыццё.

Я люблю свою маленькую Радзіму і хачу, каб яна не знікла, як многія вёскі па ўсёй Беларусі.